# Беларуская літаратура




10

Репозиторий БарГУ

# Беларуская літаратура

**Дапаможнік
для вучняў 10 класа агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай і рускай мовамі навучання**

**Пад рэдакцыяй А. І. Бельскага, М. А. Тычыны**

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Рэпазіторый БарГУ

**Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2009**

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Б43

А ў т а р ы: *А. І. Бельскі*, д-р філал. навук, прафесар; *І. Э. Багдановіч*, канд. філал. навук, дацэнт; *А. І. Белая*, канд. пед. навук, дацэнт; *Д. Я. Бугаёў*, канд. філал. навук, прафесар; *А. Л. Верабей*, канд. філал. навук, дацэнт; *Я. А. Гарадніцкі*, канд. філал. навук; *Е. А. Лявонава*, канд. філал. навук, дацэнт; *М. І. Мушынскі*, д-р філал. навук, прафесар, член-кар. НАН Беларусі; *В. П. Рагойша*, д-р філал. навук, прафесар; *А. В. Сабалеўскі*, д-р мастацтвазнаўства, прафесар; *М. А. Тычына*, д-р філал. навук

Р э ц э н з е н т ы: *В. П. Жураўлёў*, д-р філал. навук, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; *М. Ф. Шаўлоўская*, канд. філал. навук, дацэнт, член секцыі філалагічных дысцыплін Дзяржаўнай камісіі; упраўленне вучэбна-метадычнай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі (метадыст в/к *Т. В. Корбан*); *А. І. Савасцянік*, настаўнік беларускай мовы і літаратуры в/к СШ № 97 г. Мінска

Б43 Беларуская літаратура : дапам. для вучняў 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі [і інш.] ; пад рэд. А. І. Бельскага, М. А. Тычыны. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. — 272 с. : іл.
ISBN 978-985-471-319-9.

Прасочваецца развіццё нацыянальнага слоўнага мастацтва ў першай палове XX стагоддзя, раскрываецца агульны стан беларускай літаратуры ў пасляваенны час. Манаграфічныя раздзелы прысвечаны разгляду творчасці М. Гарэцкага, З. Бядулі, У. Дубоўкі, К. Крапівы, А. Мрыя, М. Зарэцкага, К. Чорнага, П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка, Я. Брыля, П. Панчанкі, І. Мележа, А. Макаёнка, У. Караткевіча.

Адрасуецца вучням агульнаадукацыйных школ, гімназій і ліцэяў, а таксама слухачам падрыхтоўчых аддзяленняў і курсаў, абітурыентам. Можа быць выкарыстаны навучэнцамі ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721

ISBN 978-985-471-319-9

© Афармленне. РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2009

Рэпазіторый БарДУ

## *Дарагія сябры!*

Змест дапаможніка цалкам адпавядае дзеючай праграме па беларускай літаратуры для X класа агульнаадукацыйных устаноў.

Гэтая навучальная кніга мае на мэце пазнаёміць з гісторыка-літаратурным працэсам розных перыядаў, дапамагчы вучням асэнсаваць жыццё і творчасць вядомых пісьменнікаў. Аналіз мастацкіх твораў адбываецца з апорай на паняцці па тэорыі літаратуры, прадугледжаныя для засваення школьнай праграмай.

Кніга для вучняў створана аўтарскім калектывам Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. У яго склад увайшлі вучоныя, якія добра вядомы сваімі арыгінальнымі даследаваннямі па гісторыі літаратуры і творчасці пэўных пісьменнікаў.

Аўтарамі асобных тэм з'яўляюцца: *І. Э. Багдановіч* («Уладзімір Дубоўка»), *А. І. Белая* («Змітрок Бядуля»), *А. І. Бельскі* («Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны», «Пятрусь Броўка»), *Д. Я. Бугаёў* («Андрэй Мрый», «Янка Брыль», «Андрэй Макаёнак»), *А. Л. Верабей* («Уладзімір Караткевіч»), *Я. А. Гарадніцкі* («Аркадзь Куляшоў»), *Е. А. Лявонава* («Стэфан Цвэйг»), *М. І. Мушынскі* («Максім Гарэцкі», «Міхась Зарэцкі»), *В. П. Рагойша* («Максім Танк», «Пімен Панчанка»), *А. В. Сабалеўскі* («Кандрат Крапіва»), *М. А. Тычына* («Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя», «Беларуская літаратура пасляваеннага часу (да сярэдзіны 1960-х гадоў)», «Кузьма Чорны»), *А. І. Бельскі, М. А. Тычына* («Іван Мележ»). Да асобных раздзелаў дапаможніка метадычнае забеспячэнне падрыхтаваў *А. І. Бельскі*.

Рэпазіторый БарДУ

# Змітрок Бядуля
## (1886—1941)

## Звесткі з біяграфіі



Змітрок Бядуля належыць да пакалення пачынальнікаў беларускай літаратуры XX стагоддзя. У гэтым шэрагу ён стаіць побач з Янкам Купалам і Якубам Коласам, Максімам Багдановічам і Максімам Гарэцкім.

Пісьменнік нарадзіўся 23 красавіка 1886 года ў небагатай яўрэйскай сям'і ў мястэчку Пасадзец на Лагойшчыне, праз якое праходзіў стары тракт на Мінск. Сапраўднае яго імя — Самуіл Яфімавіч Плаўнік. У Пасадцы было ўсяго 18—19 хат, але ўласнай хаты сям'я Плаўнікаў не мела — настолькі яна была бедная. Жылі ў хаце дзеда, выдатнага каваля і медніка, які да таго ж быў і заўзятым кніжнікам. Бацька Самуіла быў таксама чалавекам цікавым. Ён іграў на скрыпцы, меў чулую душу і не вельмі прынявольваў сына да выбару жыццёвай дарогі. Праўда, бацькам хацелася, каб іх сын стаў рабінам, святаром у яўрэйскай рэлігійнай абшчыне, таму яны аддалі яго вучыцца ў хедар (так называлася яўрэйская школа). Там у той час з агульнаадукацыйных прадметаў вывучалася



Репозиторий БарГУ

толькі пачатковая арыфметыка — чатыры дзеянні. Астатні час займала вывучэнне Бібліі на стараяўрэйскай мове і чытанне малітваў. Як пазней успамінаў сам Змітрок Бядуля, пры адным стале сядзелі па дванаццаць гадзін каля дзесяці хлопчыкаў. Канікулы былі двойчы: месяц вясною і месяц увосень. Калі першы настаўнік, у якога давялося вучыцца, не меў звычкі біць вучняў, то другі часта пускаў у ход кулакі. У дзесяць год будучы пісьменнік ужо добра ведаў стараяўрэйскую мову, а рускай ён авалодаў самастойна, па самавучыцелі, толькі ў семнаццацігадовым узросце.

Пасля заканчэння хедара хлопчык працягваў вучобу ў ешыботе — пачатковай школе рабінаў — спачатку ў Даўгінаве, потым у мястэчку Ілья. Там былі строгія правілы, за парушэнне якіх бязлітасна збівалі. Нельга, напрыклад, было чытаць якія-небудзь кнігі, акрамя рэлігійных. Зразумела, што развітаўся Самуіл з ешыботам без асаблівага жалю. Гэта здарылася ў 1902 годзе, калі юнаку не было яшчэ шаснаццаці год. У яго запісной кніжачцы знайшлі вершы на стараяўрэйскай мове, прысвечаныя дзяўчыне Мірыям, якую ён уявіў, прыдумаў сабе, як Дон Кіхот Дульсінею Табоскую. Але для будучага рабіна такая творчасць была амаль што злачынствам, і хлопца выгналі з ешыбота. На жаль, гэтыя вершы, як і тыя, што ён пачаў пісаць ужо ў дзесяцігадовым узросце, не захаваліся.

Аднак выключэнне з ешыбота не азначала, што Самуіл марна патраціў гады, праведзеныя ў школьных сценах. Яго веданне Бібліі пазней паўплывала на змест, тэматыку і стыль твораў. Міфы і легенды пра будову свету і чалавека, пераўвасобленыя гістарычныя паданні, казкі аб розных святых ураждалі будучага пісьменніка дзівоснай фантазіяй. Гэта вызначыла, у прыватнасці, рамантычныя рысы яго далейшай літаратурнай творчасці. Рэлігійныя кнігі абуджалі таксама пачуццёвасць, эмацыянальнае адчуванне жыцця, яго таямнічасці і загадкавасці.

Лад сям'і Плаўнікаў быў амаль што сялянскі, як і ў суседзяў-беларусаў. Супольнае з імі жыццё давала шмат уражанняў, уплывала на фарміраванне асобы будучага мастака слова. Ён занатаваў вялікую колькасць незвычайных вясковых гісторый, якія пазней склалі аснову шэрага навел.



Рэпазіторый БарДУ

У Бядулі-пісьменніка, як адзначае літаратуразнаўца Іван Навуменка, былі два аўтарытэтныя настаўнікі: Біблія з яе старажытнымі гісторыямі, легендамі, духам старажытнасці і народныя скарбы, беларускія былі, міфы паганскіх часоў, якія з'ядналіся ў творчасці пісьменніка з біблейскімі міфамі. Пісьменнік Янка Скрыган успамінаў: «Дзівіліся са Змітрака Бядулі, што ён, будучы яўрэем, так любіць патрыярхальную Беларусь і так ведае прыроду сялянскай душы». Нават яго псеўданім, на думку І. Навуменкі, паходзіць з беларускага фальклору, дзе ёсць такі казачны персанаж — дзядок Бядуля, — які ходзіць па свеце, спагадаючы бяздольным, суцяшаючы пакрыўджаных і сірот. Маючы чуллівае сэрца, пісьменнік не мог абысці гэтага героя сваёй увагай.

Пасля выгнання з ешыбота Змітрок Бядуля вярнуўся дадому. Звестак пра гэты перыяд яго жыцця засталося небагата. Нейкі час ён працаваў настаўнікам яўрэйскай мовы ў ваколіцах Пасадца і ў самім мястэчку. Калі бацька ўладкаваўся на працу да багатага лесапрамыслоўца, то ўзяў сына да сябе памочнікам. Інтэлігентны юнак атрымаў магчымасць зарабіць, хоць і невялікія, грошы, а значыць меў сродкі, каб набываць кнігі, выпісваць газеты і часопісы. Усё больш настойліва заяўляе аб сабе яго літаратурны талент. У 1907 годзе Змітрок Бядуля пачаў пісаць вершы на рускай мове, нават дасылаў іх у Пецярбург. У хуткім часе яму ўдаецца наладзіць супрацоўніцтва з газетай «Наша ніва». Першы твор, які яна надрукавала, быў абразок «Пяюць начлежнікі». Менавіта ён засведчыў пра нараджэнне новага беларускага пісьменніка. Гэта адбылося 23 верасня 1910 года. А ў 1912 годзе Змітрок Бядуля едзе ў Вільню сам, каб павысіць сваю адукацыю і ўключыцца ў літаратурнае жыццё. Дэталі яго жыцця ў культурным цэнтры Заходняга краю невядомыя, акрамя тых, што звязаны з «Нашай нівай». Спачатку ён супрацоўнік рэдакцыі, затым, з 1914 года, — адказны сакратар. Самай значнай падзеяй гэтага перыяду жыцця пісьменніка з'яўляецца выхад у свет зборніка «Абразкі». І. Навуменка небеспадстаўна адзначае, што Вільня — першы «універсітэт» Змітрака Бядулі, які ён закончыў з бляскам. Пісьменнік быў вымушаны пакінуць горад у 1915 годзе ў сувязі з набліжэннем нямецкага фронту.

Рэпазіторый БарДУ

Учарашні местачковец пакідае яго адукаваным інтэлігентам, знаўцам фальклорнай даўніны, заўзятым тэатралам.

Змітрок Бядуля набывае ўсё большую вядомасць як беларускі пісьменнік. Гэта выклікае абурэнне ў яўрэйскай абшчыне, бо робіцца зразумелым, што, навучаны ў ешыбоце за яе грошы, малады чалавек зусім не збіраецца быць рабінам.

Пасля звароту з Вільні ён на нядоўгі час прыпыняецца ў родным Пасадцы, а потым пераязджае ў Мінск і ўладкоўваецца на працу ў Беларускі камітэт дапамогі ахвярам вайны. Тут адбываецца яго блізкае знаёмства з Максімам Багдановічам. У Мінску пісьменнік сустрэў Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі, перажыў нямецкую і белапольскую акупацыі. У гэты час ён супрацоўнічае ў газетах «Вольная Беларусь», «Беларускі час», «Беларусь», піша і друкуе свае творы, пераважна вершы і артыкулы. У дваццатыя гады працуе ў газеце «Савецкая Беларусь», рэдагуе часопісы: дзіцячы — «Зоркі» і краязнаўчы — «Наш край».

Многія творы Змітрака Бядулі адрасаваны дзецям. Гэта вершы, казкі, апавяданні, паэмы. Асаблівае месца сярод іх належыць казцы-паэме «Мурашка-Палашка» і аповесці-казцы «Сярэбраная табакерка», напісаным перад вайной. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны пісьменнік накіраваўся з Беларусі ў расійскі горад Уральск. Жыццё Змітрака Бядулі абарвалася 3 лістапада 1941 года.

Максім Гарэцкі, пісьменнік і крытык, адзначаў, што самая каштоўная частка творчасці Змітрака Бядулі — яго «дасканалая мастацкая проза», апавяданні, у якіх «найболей беларускіх нацыянальных прымет і аўтарскай непасрэднасці, арыгінальнасці». Варта заўважыць, што глыбей за ўсё чалавек спасцігае жыццёвыя каштоўнасці ў час вялікіх выпрабаванняў. Вось як ацаніў М. Гарэцкі беларускае апавяданне Змітрака Бядулі, калі быў на фронце ў Першую сусветную вайну: «Колькі радасці прыносіць мне наша друкаванае "мужыцкае" слова! <...> з нежаданымі спазмамі ў горле і прыкрымі хваравітымі слязьмі на вачах цалую лісты з дому і "Нашу ніву" з Вільні...» У адным з нумароў газеты былі надрукаваны «Летапісцы» Змітрака Бядулі. Як прызнаецца пісьменнік-франтавік, яны яму «душу перавярнулі.

Репозиторий БарГУ

Шкода... цябе, мая бедная, убогая, невучоная і такая багатая творчым духам мужыцкая бацькаўшчына. Плач, выпісвай, як летапісец, свае невядомыя шырокаму свету і такія, можа, малаважныя, на яго шырокі погляд, мукі свае».

«Летапісцы» — гэта адно з тых «залатых зярнят» нацыянальнай прозы, якія вывучаліся многімі пакаленнямі беларускіх школьнікаў. Да іх па праву належаць і такія апавяданні, як «Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрывасекі», «На Каляды к сыну», «Велікодныя яйкі», аповесць «Салавей». Не абмінуў Змітрок Бядуля сваёй увагай і жанру рамана («Язэп Крушынскі»).

## Абразкі

На пачатковым этапе станаўлення літаратуры празаічныя творы нярэдка пішуцца паэтамі, а гэта якраз і абумоўлівае нараджэнне адметнага жанру, своеасаблівых вершаў у прозе — лірычных мініяцюр, або імпрэсій (ад *impression* — ўражанне). Адначасова з вершамі і апавяданнямі ствараў іх і Змітрок Бядуля. Для імпрэсіі ўласціва каштоўнасць «першага ўражання», апора на першасны пачуццёвы вобраз, які ўзнікае пры непасрэдным успрыманні прадмета або з'явы, імкненне замацаваць гэтае ўражанне. Характарызуючы творчасць пісьменніка, І. Навуменка адзначаў, што Змітрок Бядуля ў беларускай літаратуры — найбольш выразны імпрэсіяніст, які імкнецца «схапіць» пачуццёвы вобраз і вызначыць яго яскравай, выразнай дэталлю.

Падрыхтаваны пісьменнікам у Вільні зборнік «Абразкі» ў 1913 годзе ўбачыў свет у пецярбургскім выдавецтве «Загляне сонца і ў наша ваконца». Ён быў надрукаваны лацінкай. Гэты зборнік М. Гарэцкі назваў «паэзіяй у прозе». Ён адзначае: «Найпышней буяе лірызм паэта ў яго "Абразках"». Назву зборніка «Абразкі» даў Янка Купала. Сам аўтар спачатку назваў кнігу «Плач пралескаў», паводле назвы адной з лірычных мініяцюр. Менавіта назва зборніка паслужыла з'яўленню такога тэарэтыка-літаратурнага тэрміна, як абразок. Такім чынам, *абразок* — жанр лірычнай мініяцюры ў прозе, які мае наступныя характэрныя асаблівасці: слаба разгорнуты сюжэт ці ўвогуле яго адсутнасць; шырокі

Рэпазіторый БарГУ

дыяпазон пачуццяў, назіранняў, зварот да ўнутранага свету чалавека; філасофска-элегічны настрой; асацыятыўнасць разважанняў.

Творы, якія склалі зборнік, пацвярджаюць выказаную М. Багдановічам думку аб Змітраку Бядулю як «пісьменніку з душою чулай і паэтычнай». У змесце «Абразкоў» вылучаецца ўласцівая яго творчасці «хвала хараству» роднай прыроды. Бядулевы мініяцюры носяць рамантычны характар, але не менш моцныя яны і сваёй народнасцю, блізкасцю да сялянскага жыцця.

Абразок **«Плач пралескаў»** (1913) мае адметную кампазіцыю. У творы аўтарам вылучаны дзве часткі. Першая ўтрымлівае пейзажную замалёўку той пары ў прыродзе, калі з'яўляюцца кветкі. Апавядаючы пра іх, Змітрок Бядуля выкарыстоўвае адметныя эпітэты і метафары, якія надаюць твору рамантычны характар. Пралескі — «дзеці вясны», «фарбаваныя небам» і «ўзгадаваныя сонейкам». І, як належыць усім дзецям, яны плачуць, апынуўшыся ў нязвыклым месцы, «на чорнай зямлі». Іх не суцяшае нават тое, што час гэтага зямнога жыцця вельмі нядоўгі. Аўтар вызначае яго з дапамогай перыфразы: «ад маладзіка да ветаха вясенняга месяца». Спяваў і кружыўся над імі жаўранак, а яны ўсё плакалі ды плакалі... Аднак нават такія розныя па эмацыянальным настроі з'явы ўтвараюць прыродную гармонію. Там, дзе плакалі пралескі, «месцамі на лагчынках лядок стаў, месцамі траўкі заселянеліся».

Прыход вясны запатрабаваў адпаведных гаспадарскіх клопатаў, пра якія Змітрок Бядуля згадвае ў другой частцы мініяцюры. Тут пераважаюць лексічныя сродкі, якія ствараюць рэалістычную карціну штодзённага сялянскага побыту. Новыя плугі-нарогі панёс ад каваля на плячах земляроб; дзяцюк ахвотна пакарміў быкоў, якіх хутка трэба будзе запрагаць у гэтыя плугі. Нават дым з каміноў, што весялей пакіраваўся ў веснавое неба, калі гаспадыні звыкла ўзяліся гатаваць снеданне, «быццам кудзеля». І ўсе гэтыя дэталі сялянскага жыцця пісьменнік малюе на фоне грандыёзнай рамантычнай дэкарацыі: «Палала зарніца над бярэзнікам». Рамантычнае гучанне многім радкам надае інверсійная будова фразы.



Рэпазіторый БарДУ

Так, як рэалістычнае і рамантычнае, спалучаюцца ў жыцці і мастацтве радасць і трагедыя. Пра гэта сведчаць адчуванні дзяўчыны, якая дачакалася вясны, ступіла босай нагою на сагрэтую зямлю, убачыла расу на пялёстках кветак і раптам прыгадала, што заканчваецца яе бесклапотнае жыццё — «за нямілага замуж выдаюць». Пісьменнік сваім чуллівым сэрцам спачувае дзяўчыне, гора якой падзяляюць і «бярозка маладая», і «пралескі, дзеці вясны», якія не могуць спыніць слёз.

Народнасць «Плачу пралескаў» заключаецца не толькі ў вобразах і матывах, узятых з сялянскага жыцця, а і ў выкарыстанні аўтарам мастацкіх сродкаў, запазычаных з беларускага фальклору. У творы выявілася таксама характэрная для абразкоў фрагментарнасць, эцюднасць, непаўната ахопу з'яў. Некаторыя вобразы нібы яшчэ не склаліся канчаткова. Такое ўражанне стварае, напрыклад, неаднаразова ўжытае аўтарам шматкроп'е.

Абразок **«Нібы рупны араты...»** (1913) перадае зменлівасць, цякучасць настрою лірычнага героя, што абумоўлена разнастайнасцю фарбаў, гукаў, пахаў знешняга свету: «над рэчкай месяц бляднеець»; «вароны пачалі крычаць... над зялёнай елкай»; «канюшына смачна запахла». Выкарыстанае Змітраком Бядулем параўнанне, якое дало назву твору, быццам бы ўраўноўвае працу пісьменніка, паэта, што ўздымае, як пісаў Янка Купала, «скібіну» роднага слова, і аратага, які ідзе па палетку за плугам. Кожны з іх жадае, каб яго ніва красавала шчодрым калоссем. У беларусаў ёсць прыказка «Хто рана ўстае, таму Бог дае». Таму «на дзядзінец» герой Змітрака Бядулі выходзіць раненька, на досвітку, «яшчэ як сам Бог спіць, здаецца». Гэтае параўнанне нібы вяртае чытача да часоў, якія папярэднічаюць стварэнню свету, і дае адчуць сябе яго стваральнікам.

Як лічылі старажытныя філосафы, прыгажосць свету звычайна адкрываецца чалавеку адзін раз; другі раз — толькі вельмі шчасліваму; ніколі — вельмі няшчаснаму. І калі яна паўстае перад вачыма, чалавек ужо не той. Герой лірычнай мініяцюры Змітрака Бядулі «Нібы рупны араты...» шчодра дзеліцца той прыгажосцю, якая адкрылася яму. Пейзажная карціна, створаная Змітраком Бядулем,



Рэпазіторый БарДУ

уключае ў сябе з'явы прыроды і жыцця, звыклыя для беларуса: рэчка, месяц, «густы хвойнік на лагчыне», бярэзнік, начлежнае вогнішча... Але іх сціплыя абрысы патанаюць то ў «белым моры тумана», то ахоплены «чырвоным морам усходняй зарніцы», і гэта надае пейзажу рамантычную афарбоўку. Аднак у бязмежнасці сузірання не губляюцца драбніцы побыту: «Галавешкі... смаляцца пад сухім карчом»; «...у вёсцы вароты заскрыпелі...»

У перадачы ўнутранага стану свайго героя Змітрок Бядуля таксама спалучае рамантычную вобразнасць з надзвычай рэалістычнымі дэталямі. Чалавек мучыўся бяссоннай ноччу «ў нейкай непрытомнай гарачцы». Думы абхапілі яго сэрца, «быццам калючыя шышкі». Ратунак прыйшоў разам з усходам сонейка, якое выклікала жаданне даслаць «шчырую малітву дню» і скінуць цяжкія думы начныя, «як непатрэбныя атопкі». Асаблівасці пабудовы пісьменнікам сказаў і пастаноўкі ў іх знакаў прыпынку дапаўняюць «кардыяграму» душэўнага стану героя, які захапляецца хараством роднай прыроды, разважае пра велічнасць жыцця, пакутуе над разгадкай яго вечных пытанняў.

## Апавяданне «Бондар»

Апавяданням пісьменніка ўласцівы яркі, сакавіты малюнак, гушчыня фарбаў, прыгажосць і свежасць параўнанняў, трапнасць слоў і чыста народная вобразнасць. Сярод ранніх апавяданняў няма разгорнутых, з шырокім ахопам падзей, твораў. У іх звычайна адзін-два героі, адна падзея, адна псіхалагічна-эмацыянальная настраёвасць. Нягледзячы на тое, што ў апавяданнях пераважае сацыяльная праблематыка і падаюцца даволі разгорнутыя малюнкі побыту, яны не з'яўляюцца для Змітрака Бядулі канчатковай мэтай творчасці, а выкарыстоўваюцца для вырашэння больш значных задач. Інакш кажучы, пісьменнік дае магчымасць штодзённасці расправіць крылы. Адна з мэт гэтага — услаўленне хараства, і не толькі хараства прыроды, а і таго, якое ствараецца рукамі таленавітых народных майстроў. Гэтым вызначаюцца змест і мастацкія асаблівасці апавядання «Бондар» (1920).



Рэпазіторый БарДУ

Бондар — майстар па вырабе драўлянага посуду (бочак, дзежак, цэбраў і інш.). Змітрок Бядуля стварае вобраз здольнага рамесніка Данілы, з рук якога зробленыя рэчы выходзілі не толькі «моцныя, гладкія», але і «вельмі зграбныя». У яго іх ахвотна куплялі ўсюды, і ён жыў з жонкай прыпяваючы... «Залатыя рукі», як казалі аб ім суседзі. Гэтыя працавітыя рукі кармілі яго даволі шчодра.

У апавяданні ўвасоблены роздум пісьменніка над лёсам таленавітага героя. «Залатыя рукі» радавалі іх гаспадара Данілу не тымі залатоўкамі і рублямі, што яны яму давалі, а «здатнасцю і кемнасцю». Мэтай яго жыцця былі не заработкі, а праца сама па сабе, той любімы яе час, які дае майстру сапраўднае шчасце. Кожную пасудзіну ён рабіў з душой, натхнёна ад пачатку да канца і, майструючы, не думаў ні аб чым іншым, як аб сваёй рабоце. Нікому, апрача жонкі, няможна было глядзець, як ён майструе. Суседзі гэта ведалі і не заходзілі да яго ў хату, каб не перашкаджаць. А калі хто яшчэ не ведаў і з'яўляўся не ў час у бондаравай хаце, дык стары пакідаў працу і з нецярплівасцю чакаў хвіліны, калі госць выйдзе, ці нават сам прасіў таго, хто доўга заседжваўся, не перашкаджаць і не тлуміць галаву рознымі байкамі. «Выходзіла так, — зазначае Змітрок Бядуля, — што ён міжволі выганяў людзей з сваёй хаты». Яны крыху на яго за гэта злавалі, але паступова прывыклі. Сам Даніла працаваў з ахвотай, «дадумаўся да розных паляпшэнняў у бондарскай рабоце», вынайшаў «сваю форму, свой спосаб». Ён «песціў у сваім сэрцы агромную радасць творчасці», і «яго жыццё было поўна для яго цікавасці». На сваіх звычайных суседзяў, пазбаўленых такога адчування, майстар глядзеў іранічна, «звышку», нібы яны яшчэ не дараслі да разумення той вялікай таямніцы, якая вядома яму. Але, разам з тым, «ён не радаваўся іхняму няведанню», баяўся быць абсмяяным і хацеў, каб яго зразумелі. Змітрок Бядуля перакананы: «Ён бы паведаміў аб тым, як захопліваюць чалавека нязмерная радасць і шчырае шчасце, калі ён бачыць, што рукі яго твораць адну пекнату». Аднак, умеючы спрытна працаваць, Даніла не ўмеў гэтак жа гаварыць, а таму «нёс пакуту маўчання з пакорай у сэрцы». Бо, сапраўды, ці можна перадаць словамі, «як ён пераглядаў,

Рэпазіторый БарДУ

перамацваў рукамі, пробаваў на язык палены, дошкі і звычайныя кавалкі дрэва... як з імі няньчыўся, каб стварыць з іх новае хараство, каб у іх душу пераліць»?

Змітрок Бядуля паказвае, як непадобнасць творцы, мастака да іншых людзей можа зрабіць яго адзінокім. Пісьменнік дэталёва апісвае, як доўга — не «проста з моста» — рыхтуецца майстар да новай цікавай працы. Некалькі гадзін ён аддае шліфоўцы інструментаў, наводзіць глянец, дзівіцца на іх, «як на любых дзяцей». «Трэба адкінуць, як шалупіну, усе жыццёвыя будні — сон і яду», бо ён мусіць забыцца аб усім навокал і ў цішы начной думаць і думаць, меркаваць і меркаваць, разважаць «і туды і сюды, і ў добры і ў кепскі бок», нібы закладваючы «фундамент вялікаму гораду», каб выйшла «як найлепш, як найпякней, як найскладней...». Змітрок Бядуля называе такі стан Данілы пачаткам «цуду», які магчымы пры наяўнасці вялікага вопыту, што «набываецца доўгімі гадамі, рупнасцю, цярплівасцю, трываласцю і замілаваннем да сваёй працы». Калі па вечарах Даніла працуе, жонка мяняе лучыну за лучынай, «усімі сіламі стараецца трымаць “вечны агонь” у адной меры», і пры сваім нецікавым абавязку дзівіцца на залатыя Данілавы рукі. Нарэшце па бляску вачэй майстра, па маршчынах на яго лбе Аўдоцця пазнае, што цуд пачынаецца. Цяпер лішняга слова яму казаць нельга, каб не парушыць натхнення. Змітрок Бядуля характарызуе ўплыў свайго героя-мастака на наваколле амаль так, як гэта робіць Янка Купала ў паэме «Курган», апавядаючы пра гусляра ў час іграння: калі той выйдзе і ўдарыць па струнах, «Пушча-лес не шуміць, белка, лось не бяжыць, // Салавей-птушка ў той час сціхае, // Паміж вольхаў рака, як штодзень, не бурліць, // Паплаўкі рыба-плотка хавае...». Калі ж Даніла майструе свае зграбныя рэчы, яго жонцы здаецца, «што нават вецер цішэе ў той час... дрэвы на гародзе не шумяць і птушкі не пяюць». Аўдоцця не дзівіцца: інакай быць не можа, бо Даніла валодае вялікай сілай. Ніхто з жывых істот не мае права перашкаджаць майстру, трывожыць яго, нават ні муха не павінна гудзець, ні мыш скрэбціся.

У апавяданні «Бондар» Змітрок Бядуля асэнсоўвае тэму мастака і мастацтва ў яе непарыўнай сувязі з сацыяльнай праблематыкай. Ён сцвярджае, што бачыць і тварыць

Рэпазіторый БарДУ

прыгажосць могуць не толькі ў «пышных абставінах багатых салонаў» — «усё прыгожае відаць і ў прастаце і ў шчырасці». І калі чалавек мае магчымасць рэалізаваць свае творчыя здольнасці, гэта змяняе да лепшага свет у ім і вакол яго. «І сонца на яго тады па-новаму глядзіць, і камень і дрэва яму песні пяюць».

Аднак Даніла лічыў, што «звычайнае вока не захапляецца парывамі вялікай душы, не блішчыць агнём шчырага падзякавання вялікаму майстру». Гэтае вока глядзела на «ўрачыстае свята» сэрца мастака як на дзіцячыя забавы, што вельмі засмучала майстра. Ён быў упэўнены, што пані, ад якой атрымаў заказ і адмыслова яго выканаў, «надзене на яго чало вянок славы». Але надзеі майстра не спраўдзіліся. Везучы пасудзіны ў панскі двор, Даніла думаў: «Зараз пачую прысуд пані... Яна правільна ацэніць, бо не такая варона дурная, як нашы мужыкі». Аднак пані выявіла нечаканую для Данілы чэрствасць і абыякавасць. Каб паказаць гэта, Змітрок Бядуля скарыстаў простую, але пераканаўчую дэталь. Калі Даніла з Аўдоццяй прывезлі панскі заказ у двор, то «...адзін верабей, хітрун і падшывалец, апаганіў чысценькі, бялюткі цабэрак», гэтым самым нахабна насмяяўшыся з іх чыстых пачуццяў. Тое ж па сутнасці зрабіла і пані, якая, нават не пацікавіўшыся глянуць на дасканалую работу, «заплаціла не таргуючыся, і гэтым справа скончылася». Насуперак спадзяванням Данілы, што ў пані незвычайнае вока і яна здолее ўгледзець дарагі скарб там, дзе ён сапраўды ёсць, высветлілася, што яе вока гэтак жа «не захапляецца парывамі вялікай душы, не блішчыць агнём шчырага падзякавання вялікаму майстру». У выніку Даніла, як піша аўтар, «пахаваў найлепшую частку сваёй душы» і канчаткова ўсумніўся ў тым, што яго калі-небудзь змогуць зразумець простыя людзі. Дагэтуль гарэлкі ён не піў, а цяпер закінуў бондарства зусім, нават «у хаце рэдка калі бываў — валяўся цэлымі днямі п'яны ў карчме пад сталом». Гэта прывяло майстра не толькі да змарнавання таленту, а і да смерці. Змайстравалі людзі труну, «шурпатую і нязграбную», ды і пахавалі ў ёй майстра з залатымі рукамі. Вяскоўцы засталіся ў крыўдзе на Данілу. Яны казалі: «Калі б каго-колечы з нашых Даніла навучыў, той добрым словам

Рэпазіторый БарДУ

успамінаў бы, як бацьку роднага шанаваў. А то ад пані з двара пахвальбы чакаў...»

Вобраз таленавітага бондара Данілы займае адметнае месца ў створанай пісьменнікам галерэі арыгінальных, непаўторных вясковых тыпаў. Ён плённа працягвае тэму мастака і мастацтва, якая займае значнае месца ў беларускім фальклоры і літаратуры.

---

1. Раскажыце пра асаблівасці адукацыі, якую атрымаў будучы пісьменнік. Як яна паўплывала на фарміраванне яго асобы?
2. Што дапамагло Самуілу Плаўніку стаць менавіта беларускім пісьменнікам? Назавіце твор, які стаў яго літаратурным дэбютам.
3. Да якіх жанраў звяртаўся Змітрок Бядуля на працягу сваёй літаратурнай творчасці?
4. Вылучыце ў абразках Змітрака Бядулі тыя вобразы і выразы, якія ўласцівы паэтычнай мове.
5. Якія вобразы ў мініяцюры «Нібы рупны араты...» можна лічыць сімвалічнымі?
6. Удакладніце значэнне выразу «начлежнае вогнішча». Прачытайце самастойна абразок Змітрака Бядулі «Пяюць начлежнікі» і яго верш «Начлежнікі пяюць. Над вогнішчам туман...». Чым прывабіла пісьменніка песня начлежнікаў? Якія асаблівасці яго творчасці знайшлі адлюстраванне ў гэтым вобразе?
7. Вызначце тэму апавядання «Бондар». Што адрознівала яго героя Данілу ад іншых вяскоўцаў?
8. Знайдзіце ў апавяданні «Бондар» партрэтныя дэталі, паспрабуйце па іх уявіць знешняе аблічча галоўнага героя. Чаму аўтар не падае яго поўнай партрэтнай характарыстыкі?
9. Дакажыце, што асноўны сродак стварэння вобраза Данілы — псіхалагізм.
10. На падставе зместу апавядання «Бондар» вызначце, у чым шчасце і ў чым трагедыя героя.
11. Складзіце на аснове апавядання «Бондар» тэматычныя слоўнікі: назвы бондарскіх інструментаў і вырабаў бондарства. Удакладніце значэнні слоў па «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» ці энцыклапедычным даведніку «Этнаграфія Беларусі».

Рэпазіторый БарДУ